

БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЕЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЧЗ ЗМЕНА

10 верасня 1994 г.
Субота
№ 99 (13816)
Кошт у розніцу 10 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

□ *"Актуальнае інтэрв'ю".* ТАЛЕНТЫ РАСТУЦЬ НА ТВОРЧЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ. 2

□ *"Паштовая скрынка".* РЭЦЭПТЫ МАЛЕНЬКІХ СВЯТ. 2

□ *"Адам і Ева".* ТЫ І Я. Пісьмо былому мужу. 3

□ *"Традыцыі".* УЗГАДАЙ МІНУЛАЕ – УБАЧЫШ БУДУЧЫНЮ. 3

Малюе Віктар ДУБОВІК





У Мінску па ініцыятыве БНФ прайшлі мерапрыемствы з нагоды 480–й гадавіны бітвы пад Оршай. Ад парку імя Янкі Купалы было арганізавана шэсце, а потым каля Дзяржаўнага акадэмічнага вялікага тэатра оперы і балета адбыўся мітынг, тэатралізаванае прадстаўленне і канцэрт.

Кур'ер "ЧЗ"

Пад прэсам часу

Сёння завяршаецца першая дэкада верасня — месяца, які прынята лічыць адметным у палітычным жыцці.Завяршаецца пара вакацый, дзяржаўныя чыны з новай энергіяй прыступаюць да выканання сваіх службовых абавязкаў.

Беларусь — не выключэнне, але сёлетні верасень у маладой краіне становіцца тым больш гарачай парой, калі прыняць да ўвагі складаныя працэсы, звязаныя з пераходам улады. Паралельна, часам перакрыжоўваючыся, адбываюцца самыя розныя падзеі. Бадай, аб'ядноўвае іх адно: фарміраванне ўладнай піраміды (маюцца на ўвазе прэзідэнцкія і ўрадавыя структуры, пакуль пэўнае зацішша толькі ў парламенце) і вызначэнне прыярытэтаў тактыка-стратэгічнага характару праходзяць пад жорсткім прэсам часу. Асабліва з улікам хуткага адкрыцця чарговай сесіі Вярхоўнага Савета такое развіццё падзей зусім зразумелае, яно патрабуе дакладных, выверaных крокаў палітыкаў апошняй хвалі, не маючых дастатковага вопыту, а сёння і часу на развагі. Гэты тыдзень быў дастаткова насычаным, як, дарэчы, і папярэднія. Па ўсёй верагоднасці, канчаткова завяршаецца размеркаванне партфеляў, прызначаныя на пасады міністры і іншыя высокія чыноўнікі даюць шматлікія інтэрв'ю, акрэсліваючы свае праграмы. Не было недахопу ў інтэрв'ю і артыкулах, прысвечаных гістарычнай даце — 480-й гадавіне бітвы пад Оршай. Угодкі бітвы, якія неадназначна трактуюць знаўцы гісторыі, сталі таксама адметай тыдня, прынамсі, апазіцыйныя палітыкі зрабілі іх святкаванне прадметам галоўнага клопату і прыкладання намаганняў. Сярод прэс-канферэнцый вызначаліся дзве: на шэраг пытанняў журналістаў адказалі кіраўнік упраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі ў адміністрацыі прэзідэнта Аляксандр Фядута і міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Сянько. Навіной тыдня можна лічыць і звесткі аб шпіталізацыі прэзідэнта ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя. Хаця ўрачы і дазволілі яму выконваць службовыя абавязкі пры ўмове захавання строгага пасцельнага рэжыму, на нейкі час палітычная ініцыятыва, відаць, перайшла да прэм'ера. Дэлегацыя беларускага ўрада ў складзе Міхаіла Чыгіра, віцэ-прэм'ера Віктара Ганчара, міністра па справах СНД Уладзіміра Заламая, міністра абароны Анатоля Кастэнкі і іншых афіцыйных асоб учора прыняла ўдзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў-удзельніц Садружнасці. Нацыянальныя прыярытэты звязваліся з рэалізацыяй дагавора аб стварэнні эканамічнага саюза, у прыватнасці — праекта пагаднення аб стварэнні міждзяржаўнага эканамічнага камітэта, прызначанага стаць пастаянна дзеючым каардынацыйным органам эканамічнага саюза. Міхаіл Чыгір выказаў думку, што другі дакумент, які выносіцца на пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў — праект пагаднення аб стварэнні плацёжнага саюза — павінен ажыццяўляцца па прынцыпах прызнання нацыянальнага валютнага суверэнітэту. Вынікі маскоўскай сустрэчы сёння ўжо вядомыя, пытанне ў тым, наколькі эфектыўна пачнуць ажыццяўляцца дамоўленасці.

Тым часам на пасяджэнні прэзідыума Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі разгледжана тактыка дзеянняў і ўдакладнена пазіцыя прафсаюзаў па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўных. Адзначыўшы, што многія прапановы ФПБ улічваюцца ў праекце антыкрызіснай праграмы, прэзідыум палічыў неабходным настойваць на павышэнні мінімальнай зарплаты да 25 тысяч беларускіх рублёў.

Якаў ЯСЭПКІН.

Абаронім сябе самі

Мінская асацыяцыя "Насельніцтва за бяспеку" заявіла аб сваім намеры выйсці на рэспубліканскі ўзровень. Супрацоўнікі асацыяцыі пачалі рыхтавацца да правядзення ўстаноўчай канферэнцыі з нагоды змянення гарадскога статуса арганізацыі на рэспубліканскі.

"Насельніцтва за бяспеку" аб'ядноўвае сёння каля 250 фірм і ўстаноў, якія займаюцца вытворчасцю ахоўных сродкаў, аказваюць юрыдычныя паслугі, забяспечваюць ахову маёмасці, правапарадку і суправаджэнне грузаў, а таксама налічвае ў сваіх радах каля 200 прыватных асоб з Беларусі, Польшчы, Расіі і Германіі. Членам асацыяцыі стала і германская фірма "Hidenbrand Elektronik GmbH", якая пастаўляе тэхніку для паліцыі. Зараз асацыяцыя стварае новыя службы: выратавальную (накшталт амерыканскай "Тэлефон 911"), клуб агульнай дапамогі і аўтамабільнага сервісу, крымінальны канал экстраннай радыёсувязі і крымінальны тэлефон даверу. Пад эгідай асацыяцыі пачаў працаваць і навучальна-спартыўны цэнтр грамадскай бяспекі і самаабароны "Супрацьстаянне". Ён наладзіў заняткі па авалоданню газавай зброяй і адкрыў з 1 верасня курсы самаабароны. Яны разлічаны на навучанне і дзяцей, і дарослых, у тым ліку асацыяцыя прадугледзела правядзенне спецыяльных заняткаў самаабароны для жанчын.

Наталля ВАЛАКІДА.

Есаул, есаул, дзе ж ты знойдзеш каня?

Палітычных партый ды рухаў ад "паўтара чалавека" да паўтары сотні ў Віцебску, як і па ўсёй Беларусі, хоць адбаўляй. Не хапала толькі казачых згуртаванняў.

Ды, мусіць, хутка з'явяцца і яны, паколькі атаманы ды есаулы ўжо ёсць. Як паведаміла адна з мясцовых газет, у Маскву на казачы круг выязджае дэпутат гарсавета В.Афанасьеў. Адтуль ён павінен вярнуцца ў званні палкоўніка казачых войскаў, атамана Віцебскага і Прыдняпроўскага. Вядома, апрануць прыгожы мундзір з залатымі пагонамі ды шабляй збоку — вельмі прывабна. А калі ўлічыць, што ў горадзе казакоў бачылі толькі па замежным тэлебачанні, — эфект будзе проста шакіруючым. І ўжо тады многія забудуцца, што навaспечаны атаман — некалі звольнены "з трэскам" без права атрымання пенсіі армейскі маёр юстыцыі.

Якое воінскае званне ў Барыса Мацвеевіча, майстра прафтэхвучылішча і дэпутата аблсавета, невядома. Але ў стольнай яму абяцаюць есаула (маёра) і пасаду начальніка казацкай школы.

Думаецца, упаўне заслужана, бо дэпутат Мацвееў смела выкрывае ўсіх чыноўнікаў ад улад і не збаяўся нават генерала Я.Бачарова: судзіўся з ім і, мусіць, судзіцца і цяпер.

Яўгенія ВІЦЬБА.

І пчолкі парадавалі

Цяпер тым, што ў многіх арганізацыях ёсць пчолапасекі, нікога не здзівіш. Вось і ў Асіповічах пчаляроў хапае.

І няма чаго скрываць, у гэтым засушлівым годзе ў многіх недабор мёду. А вось для Асіповіцкага лясгаса, дзе 120 пчоласем'яў, гэты год аказаўся зусім нядрэнным. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, тут атрымалі амаль 300 кілаграмаў высакаякаснага мёду. Кожны працуючы тут зможа набыць яго па зніжаных цэнах. Здаецца дробязь, але прыемная.

Іван СЦЯПУРА.

Спакуслівыя завушніцы

Пяць пар залатых завушніц адабрала ў малодшых вучняў Маладзечна нейкая Наташа В. 24–гадовая прайдзісветка, сустракаючы даверлівых дзяўчынак пасля школы.

Прыкідваючыся знаёмай іх матуль, яна вяла дзіця да бліжэйшага пад'езда, дзе, маўляў, у яе кватэры знаходзіцца мама дзяўчынкі. Па дарозе, гладзячы дзяўчынку па галаве, непрыкметна для яе здымала залатыя ўпрыгожанні. "Знаёмую" затрымалі.

Мікола КАПЫЛОВІЧ.

Курсы валют на 9 верасня:

	Даляр ЗША		Ням. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	2880	2965	1857	1910
"Прыор"	2900	2940	1870	1900
"Дукат"	2860	2950	1840	1910

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Таленты растуць на творчым факультэце

Сёлета аднаму са старэйшых факультэтаў Белдзяржуніверсітэта — журфаку спаўняецца 50 гадоў. Папулярнасць гэтай навучальнай установы заўсёды была вялікай. Сёлетні абітурыенцкі жнівень таксама не выключэнне: тры чалавекі прэтэндавала на адно журфакаўскае месца. І толькі 102 шчаслiўчыкі сталі студэнтамі факультэта. Наперадзе ў іх пяць гадоў вучобы. Як пройдуць яны, чым запомняцца? Лепш, як ніхто іншы, ведае гэта дэкан факультэта журналістыкі, доктар навук, прафесар Алег Георгіевіч Слука, лёс якога звязаны з журфакам з1964 года. Па традыцыі мы запрасілі Алега Георгіевіча, члена рэдкалегіі нашай газеты на вераснёўскую гутарку. І пачалі размову з пытання аб тым, чым, на думку дэкана, вабіць журфак моладзь?

— Я лічу, што папулярнасць нашага факультэта ніколі не ўпадзе. І, між тым, яна дасягнула пэўнай інтэлектуальнай вышыні, за якой у сучасных маладых людзей выразна праяўляецца добрае бачанне таго, што яны хочуць, да чаго імкнуцца. Журфак інстытут творчы, гэта вядома. І тыя сто юнакоў і дзяўчат, якія прыйшлі да нас сёлета, дакладна ведалі, што калі ёсць у іх душах паэтычная іскра, калі ёсць прага да прозы, калі ёсць жаданне выказацца ў публіцыстыцы, то гэта можна зрабіць толькі праз журфак. Тут яны змогуць усталяваць свае мары, свае памкненні. Кожны з іх усё-такі нясе ў душы пачатак творчасці ў розных галінах мастацтва. Таму і такі прэстыж у факультэта.

У гэтым годзе мы пайшлі на своеасаблівую дзяржаўную хітрасць. Набралі на першы курс не 50 чалавек, як гэта планавалася бюджэтам, а 102. Палова з іх будзе аплачваць сваё навучанне на факультэце. І, ведаеце, людзі гатовыя аддаваць свае грошы за вучобу на дзяржаўным журфаку, а не нясуць іх у камерцыйныя ВНУ. Як бы там ні было, у апошніх наўрад ці можна навучыць сапраўднай творчасці. Бо творчасці могуць вучыць толькі творчыя людзі ў творчым інстытуце, якім і з'яўляецца факультэт журналістыкі ў Белдзяржуніверсітэце.

— Алег Георгіевіч, а якія ўвогуле вашы сёлетнія першакурснікі? Што ў іх душы, што ў іх думках.

— У гэтых маладых людзей ужо выпрацавана вельмі сталая думка. Яны хочуць працаваць на ідэю, якая звязана з добрым жыццём беларускага народа. Палітычны і гаспадарскі ўзровень нашых першакурснікаў больш высокі, чым некалькі гадоў назад. Яны маюць даволі грунтоўнае палітычнае разуменне тых працэсаў, што зараз адбываюцца ў рэспубліцы. Ім уласціва глыбокае асэнсаванне эканамічных накірункаў дзяржавы. Канешне, яны не змогуць сёння абгрунтаваць праграму выйсця з эканамічнага крызісу, але ў іх ёсць жаданне рабіць нешта канкрэтна. Калі гэта так, то я думаю, што ў новым стагоддзі, дзе пачнуць працаваць сённяшнія першакурснікі, будзе сфармулявана новая грамадская думка, і журналісты, бясспрэчна, паўплываюць на яе. Вось што такое студэнты факультэта сёння.

— Сёлета таксама адбыўся і чарговы выпуск на факультэце. Цікава, як склаліся лёсы вашых выпускнікоў, якім фарміраваць грамадскую думку ўжо сёння? Наколькі ўплывовыя сродкі масавай інфармацыі скарысталіся паслугамі былых студэнтаў?

— Няма супярэчнасцей паміж дзейнасцю журналістаў, якія выйшлі з факультэта ў гэтым годзе, з той вучобай, якую яны прайшлі. Мы выпусцілі 75 чалавек з беларускага аддзялення і 25 — з замежнага. Апошнія паехалі працаваць па ўсім свеце. А першыя ўладкаваліся амаль ва ўсе сталічныя выданні. Узросшы працэс стварэння друкаваных органаў, тэлерадыёканалаў патрабуе вялікай арміі журналістаў, попыт на іх такі, што гэта прафесія ўсё яшчэ ў дэфіцыце.

На нашых выпускнікоў няма і не будзе рэкламацый, таму што вельмі хутка змяніліся падыходы да навучання журналістаў на факультэце. Мы маем вялікі вопыт уласны, былога Саюза, а зараз і славянскі. Да таго ж мы пачалі актыўна выкарыстоўваць еўрапейскі і сусветны вопыт і не з боку яго крытыкі, а з боку вылучэння найбольш карыснага для навучання. Акрамя таго, мы можам сёння пасылаць сваіх студэнтаў, няхай не ў масавым парадку, вучыцца ў Польшчу, Германію, Злучаныя Штаты. І ў мяне ёсць надзея, што наша журналістыка стане адэкватнай таму рэальнаму жыццю, якое мы маем.


— Нашы вераснёўскія гутаркі, Алег Георгіевіч, ужо становяцца традыцыйнымі. Памятаеце, у леташняй размове Вы распавядалі пра змены, якія чакалі студэнтаў у вучэбным працэсе. Мінуў год, ці працягвае журфак ісці па шляху перамен, ці прапануе штосьці новае будучым журналістам?

— Прапануе. З гэтага года ў нас уведзена новая спецыяльнасць — літаратурная работа. Гэта азначае, што на факультэце будуць вучыцца маладыя празаікі, пісьменнікі, драматургі. Прыкладна, адна трэцяя частка абітурыентаў прыйшла ўжо да

(Пачатак. Заканчэнне на 2-й стар.)

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

"Уорлднэт" — "Еўраньюс" — "Суперчэннэл"



ГУАНТАНАМСКІ "РЫМ"

Нягледзячы на няспынныя перагаворы паміж Кубай і ЗША па пытаннях бежанцаў, сітуацыя на амерыканскай базе ў Гуантанама робіцца крытычнай.

Цяпер там размешчаны 24 тысячы кубінцаў і 14 тысяч бежанцаў з Гаіці. Умовы жыцця тут даволі пасрэдныя, бываюць перабоі з забеспячэннем пітной вадой, прадукты харчавання — нізкай якасці. Цяпер на кожным квадратным кіламетры ўтрымліваецца па 100 чалавек. Паток бежанцаў, здаецца, пайшоў на спад. У сераду берагавая ахова "вылавіла" 826 кубінцаў.

РОЗНАГАЛОССІ Ў ІРА

Лідэр палітычнага крыла Ірландскай рэспубліканскай арміі (ІРА) "Шын Фейн" Джэры Адамс звярнуўся да кіраўніка непрымірымай групоўкі ў гэтай арганізацыі — Пейслі з прапановай правесці перагаворы.

Мяркуецца, што гаворка будзе весціся адносна спынення агню, аб'яўленага ІРА пасля 25 гадоў ваенных дзеянняў.

ЗНОЎ ШУКАЮЦЬ ПЛЕЙШНЕРА?

У цэнтры Цюрыха адбыліся 3 інцыдэнты, пры якіх мела месца перастрэлка паміж невядомымі і паліцэйскімі ў цывільным.

У выніку два чалавекі паранены.

ВЯЛІКІ БРУСЕЛЬСКІ СХОД

У Бруселі створаны Еўрапейскі сход навукі, на які прыбылі вядучыя вучоныя Еўропы.

Многія з іх — лаўрэаты Нобелеўскай прэміі. Каля 100 вучоных Еўропы павінны распрацаваць навуковыя праекты ў розных галінах навукі. Першае заданне сходу — новая навуковая праграма, на распрацоўку якой ужо выдзелена 12 мільярдаў экю.

НЕБЯСПЕЧНАЯ АКВАТОРЫЯ

Брытанская арганізацыя па ахове жывёл б'е трывогу: тысячы марскіх птушак знаходзяцца пад пагрозай вымірання.

Галоўная прычына — вялікая колькасць катастроф прамысловага транспарту ў акваторыі брытанскіх астравоў. Паводле статыстыкі, на працягу толькі месяца ва ўзбярэжных водах Вялікабрытаніі адбываюцца 52 інцыдэнты, звязаныя з забруджваннем навакольнага асяроддзя.

Дзяжурныя па выпуску перакладчык Андрэй СІДАРАЎ, рэдактар Якаў ЯСЭПКІН.



БІЗНЕС-КЛАС

ПРАДСТАЎНІЦТВА АДКРЫТА Ў МІНСКУ

Назначаны кіраўніком пастаяннага прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Крыстафер Уіялабі ў сувязі з прыбыццем у Мінск дырэктара 4-га Еўрапейскага дэпартамента Сусветнага банка Бэзіла Кавальскага і адкрыццём прадстаўніцтва 5 верасня арганізаваў кактэйль-прыём. На ім прысутнічалі вядомыя беларускія эканамісты, бізнесмены і палітыкі, прадстаўнікі замежных пасольстваў і міжнародных арганізацый, журналісты. Банк прызначаны садзейнічаць эканамічнаму росту рэспублікі, аказваць тэхнічную дапамогу і праводзіць кансультацыі сваіх спецыялістаў з мэтай аказання садзейнічання ў павышэнні эфектыўнасці пэўных сектараў эканомікі і значэння гэтых сектараў для нацыянальнага развіцця.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА.

ЗНОЎ У ГАСЦЯХ СУСВЕТНЫ БАНК

У Беларусь прыбыла дэлегацыя Сусветнага банка. Як паведамілі ў сектары Кабінета Міністраў па каардынацыі работы рэспубліканскіх органаў з міжнароднымі эканамічнымі і фінансава-крэдытнымі арганізацыямі, мэтай прыбыцця дэлегацыі ў Мінск з'яўляецца абмеркаванне вынікаў выканання нашай рэспублікай узятых перад Сусветным банкам абавязацельстваў у рамках фінансавання праграмы структурных рэформ і магчымага прыцягнення фінансаў гэтай арганізацыі на 1995 год.

У першы дзень знаходжання дырэктар 4-га Еўрапейскага дэпартамента Сусветнага банка Бэзіл Кавальскі і выканаўчы дырэктар банка Вальтэр Рыла сустрэліся з кіраўніцтвам міністэрстваў фінансаў, знешніх эканамічных сувязей, Нацыянальнага банка рэспублікі. 6 верасня адбыліся рабочыя сустрэчы прадстаўнікоў гэтай міжнароднай фінансавай арганізацыі з кіраўніцтвам Кабінета Міністраў Беларусі. У ходзе гутарак падкрэслівалася неабходнасць падтрымання больш цесных узаемавыгадных эканамічных кантактаў паміж Сусветным банкам і Беларуссю. На сённяшні дзень рэспубліка атрымлівае фінансаванне па дзвюх пазыках Сусветнага банка: рэабілітацыйнай —у памеры 120 мільёнаў даляраў і інстытуцыянальнай — у памеры 8,3 мільёна даляраў ЗША. Частка першай з іх (каля 95 мільёнаў) прызначалася для продажу на Міжбанкаўскай валютнай біржы. Астатняя сума была накіравана на закупку медыкаментаў. Інстытуцыянальная пазыка прызначалася для развіцця сістэмы дзяржаўнага кіравання. У жніўні гэтага года была падпісана яшчэ адна пазыка — на развіццё лясной гаспадаркі рэспублікі ў суме 41,9 мільёна даляраў. У гутарцы аб выніках супрацоўніцтва было сказана, што эксперты Сусветнага банка цяпер завяршылі ў рэспубліцы даследаванні ў галінах сельскай і лясной гаспадарак, энергетыкі, транспарту, працоўных рэсурсаў і прыватнага сектара. Унесены канкрэтныя прапановы па іх рэфармаванню.

7 верасня члены дэлегацыі сустрэліся са старшынёй Вярхоўнага Савета і прэзідэнтам Беларусі.

БЕЛІНФАРМ.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Таленты растуць на творчым факультэце

(Заканчэнне. Пачатак на 1стар.)

нас са сваімі пачаткоўскімі творамі: вершамі, апавяданнямі, расказамі. Уведзена яшчэ чатыры новыя спецыялізацыі, і цяпер іх ужо 12. Гэта зроблена для таго, каб запоўніць сваімі спецыялістамі тыя накірункі журналісцкай прафесіі, якія раней запаўняліся выпускнікамі з ВНУ Масквы, Кіева, Санкт-Пецярбурга. У прыватнасці, мы пачалі рыхтаваць журналістаў-міжнароднікаў. Сёлета 12 студэнтаў ужо атрымалі запіс у дыпломе, што яны прайшлі спецыялізацыю журналіст-міжнароднік. У будучым хочам зрабіць яе асобнай спецыяльнасцю.

Увогуле вакол факультэта створана своеасаблівая інстытуцкая аўра: працуе школа юнкораў, падрыхтоўчыя курсы, вялікая група нашага журналісцкага профілю навучаецца ва універсітэцкім ліцэі. Дарэчы, менавіта там збіраюцца найбольш таленавітыя юнакі і дзяўчаты. Яны настолькі падрыхтаваны да вучобы ў БДУ, што нават перарастаюць студэнтаў першага курса. Таму зараз абмяркоўваецца такая перспектыва, каб гэтых маладых людзей пасля заканчэння ліцэя адразу пераводзіць на другі ці трэці курс або на індывідуальны характар навучання. Апошняя форма выкарыстоўваецца і для найбольш таленавітых трэцякурснікаў. Такія студэнты заканчваюць вучобу пад куратарствам пэўнага прафесара, потым ідуць у аспірантуру, абараняюць дысертацыі, становяцца навукоўцамі, што таксама не перашкаджае ім працаваць у рэдакцыях. Для нас вельмі важна, што зараз мы маем сваю аспірантуру і свой савет па абароне дысертацый.

Такім чынам, на факультэце існуе поўны замкнуты, але адкрыты для ўсіх цыкл навучання творчых людзей у рэспубліцы.

— Зноў спашлюся на леташнюю размову. Тады Вы адзначалі, Алег Георгіевіч, што існуе вельмі сур'ёзная праблема з падручнікамі, няма сродкаў для іх выдання, студэнты вучацца літаральна па канспектах. Ці зварухнулася справа з месца?

— Не. Адны падручнікі былі зроблены паспешліва і дарэмна было думаць, што яны выратуюць усю адукацыю рэспублікі. Такім чынам была нанесена маральная, палітычная і матэрыяльная шкода вышэйшай школе. А другія падручнікі былі адсунуты на выданне на апошні план, і студэнты засталіся ў даволі складаным становішчы. Я лічу, што кіраўнікі вышэйшай школы з нейкай лёгкасцю ставіліся да гэтага пытання. Напрыклад, Вярхоўны Савет Беларусі гады два назад стварыў камісію, якая правярала сістэму адукацыі ва універсітэце. Аднак дзейнасць гэта абмежавалася тым, што яе члены толькі нас павучалі. Але я хацеў выкарыстаць і гэту камісію ў добрых мэтах, з пазітыўнага боку для вышэйшай школы. І прапанаваў распрацаваць канкрэтную дзяржаўную праграму з умоўнай назвай "Падручнік". Ідэя, на жаль, не ажыццявілася.

На факультэце працуе чатыры пакаленні выкладчыкаў. Гэта чатыры палітычныя і эканамічныя навуковыя пласты, калі іх аб'яднаць, то маглі б атрымацца неблагія вучэбныя дапаможнікі. Але хто іх будзе выдаваць? Я сам пішу першую частку падручніка па гісторыі беларускай журналістыкі і мяркую закончыць яго да новага года. Аднак і перада мной, прафесарам, стаіць тое ж пытанне: дзе ўзяць сродкі на выданне?

А студэнты па-ранейшаму асноўныя веды чэрпаюць з лекцый вопытных выкладчыкаў. Вельмі крыўдна, калі грамадства не ўлічвае, што сённяшняе студэнцтва — гэта цывілізацыя будучага стагоддзя і ставіцца да яе абыякава нельга. Скажыце, ці нармальна, што ўжо 15 гадоў факультэт журналістыкі знаходзіцца ва ўмовах, далёкіх ад патрэбных? Мы не маем свайго будынка. Часткова займаем аўдыторыі ў корпусе Беларускага эканамічнага універсітэта. Іх у нас 10, раскінутых па ўсіх паверхах. Пастаянныя перабежкі ў дзве змены з аўдыторыі ў аўдыторыю натуральна не спрыяюць цэласнасці вучэбнага працэсу. Але і за гэты прытулак дзякуй гаспадарам, якія таксама вымушаны былі пацясніцца. Ёсць яшчэ будынак па вуліцы Маскоўскай. Аднак мы ніяк не можам прыйсці да згоды аб яго выкарыстанні са сваімі калегамі з Нацыянальнага гуманітарнага Інстытута (раней Інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук усесаюзнага маштабу). Калі быць шчырымі, корпус на Маскоўскай выкарыстоўваюць і для камерцыйных мэт. На гэтых плошчах размяшчаецца еўрапейскі гуманітарны універсітэт. Пагаворваюць, што сюды ж накіроўваецца міжнародная школа журналістыкі. Калі гэта зробяць, то студэнтам дзяржаўнага журфака застанецца разысціся па рэдакцыях і працягваць сваю вучобу там.

Праўда, пытанне з нашым памяшканнем зараз абмяркоўваецца. Вельмі хочацца спадзявацца на станоўчы вынік, тым больш, што 1 лістапада ў нас юбілей — 50 год. Журфак старэйшы факультэт у сістэме дзяржаў СНД. У яго велізарны міжнародны імідж. Прыкладна 400 дыпламаваных выпускнікоў працуюць у 120 краінах свету. У нас ёсць, так бы мовіць, свае філіялы ў Азіі, на Блізкім і Далёкім Усходзе, нашы кандыдаты навук працуюць нават у Сарбоне. А мы самі, маю на ўвазе ўмовы для навучання, засталіся ля разбітага карыта. Гэта абраза для беларускай вышэйшай школы.

Хацелася б, каб кіраўнікі дзяржавы зразумелі, што нам патрэбны нармальныя ўмовы для работы, каб выхоўваць таленавітых пісьменнікаў, здольных журналістаў і нават яркіх палітыкаў.

Універсітэт, паводле майго разумення, — гэта своеасаблівы храм, дзе даюць светлуюдушу, а з ёй і веру, дзе вырошчваюць талент, а з талентам —і чалавека боскага.

— Натуральна, у буднях факультэт, як і ўсё наша грамадства, мае безліч праблем. У святах, як і ўсе мы, радуецца лепшаму. І яшчэ не аднаму пакаленню журфакаўцаў, думаецца, жыць і адным, і другім. Што б Вы параілі тым, хто марыць звязаць свой лёс з журфакам, з чаго пачынаць падрыхтоўку да наступнага жніўня будучым абітурыентам.

— Мы ўсіх будзем ветліва сустракаць і прывячаць. Але я хацеў бы звярнуцца да настаўнікаў школ. Прыемна, калі да нас прыходзяць вучні, якія добра ведаюць беларускую, рускую, замежную літаратуру, якія адчуваюць паэзію і шчыра паважаюць беларускую мову. Нам прыемна мець справу з людзьмі, якія падаросламу асэнсоўваюць жыццё, паспыталі працы ў раённай газеце, маюць свае публікацыі. Дзякуй тым настаўнікам, што рыхтуюць такіх людзей, і дзякуй вучням, якія хочуць выйсці на творчы шлях. Няхай шмат чытаюць, пішуць. І тады наша сустрэча завяршыцца тым, што яны стануць студэнтамі творчага факультэта.


Гутарыла Вольга ШАЎКО.

Падпіска–справа сур'ёзная.Засталіся апошнія дні.Спяшайцеся!



АТЫ-БАТЫ

Абавязак



Дэсантнікі....


Пры гэтым слове загараюцца вочы ў хлопчыкаў, а ў людзей бывалых з'яўляецца добрая зайздрасць іх выпраўцы, ведам, вывучцы, смеласці і вынослівасці. Дэсантныя войскі маладой Рэспублікі Беларусь заўсёды наперадзе, яны могуць літаральна ўсё. Служаць хлопцы цяпер толькі на тэрыторыі рэспублікі. Так вырашыў наш парламент.

Жыццё арміі стала больш адкрытым. Да прыкладу, для прадстаўнікоў абласной прэсы было арганізавана знаёмства з армейскімі буднямі і бытам дэсантнікаў 32–й Гвардзейскай паветрана–дэсантнай брыгады, якая знаходзіцца ў пагранічным Брэсце. У брыгадзе служаць хлопцы, прызваныя з нашай рэспублікі. Яны і прадэманстравалі сваю натрэніраванасць, філігранную вывучку, паказаўшы ўсе элементы рукапашнага бою, сілу і спрытнасць пры ўмоўным "захопе" штаба праціўніка, выконвалі скачкі з поўным абмундзіраваннем з вышыні тысяча метраў. З годнасцю выконваюць свой абавязак сыны Беларусі.

Раман КАБЯК,БЕЛІНФАРМ.

Фота аўтара.





ПАШТОВАЯ СКРЫНКА



"ТРЫСТАНА ПАНЕСЛА Ў... ПАХОД"

Як толькі жанчыне ўдалося надзець на палец разявы-мужчыны шлюбны пярсцёнак, кола яго ранейшых забаў звужаецца да дыяметра гэтага пярсцёнка. Як жа быць? Ці ёсць выйсце? Ёсць. І прыёмы саскоквання з прыступкі сямейнага трамвая, выпрацаваныя моцнай паловай чалавецтва, падзяляюцца на доўгаграючыя і аднаразовага ўжытку.

Безадказна ўздзейнічае на жонку і яе родных упэўненасць, што яны парадніліся з фанатыкам рыбнай лоўлі ці палявання, грыбніком ці турыстам. І жонка змірыцца з "паходамі" такога здагадлівага мужа. Але хітрасць у тым, каб яна адпускала вас з задавальненнем.

"Рыбная ліхаманка" найменш эфектыўная, бо дзейнічае толькі тры месяцы і, да таго ж, ёю могуць захапіцца жонка і цешча. Паляванне надзейнае ва ўсіх адносінах, і жонка з ружжом і ў паляўнічых ботах — пакуль рэдкая з'ява. Праўда, і тут ёсць недахопы — сезоннасць, але можна ўнушыць жонцы, што ты — паляўнічы-універсал. Майце прылады на птушку, на звера, на пух і пяро, на рогі і капыты.

Калі жонка прыліпне да вас ісці ў турпаход, дабіцеся таго, каб яна стамілася яшчэ на першым кіламетры пад цяжарам рэчмяшка, у які вы цішком падклалі прас.

Лоўля рыбы добрая тым, што дзейнічае і зімой, і летам, і ў дождж, і ў сонечнае надвор'е.

Жонка павінна з нецярплівасцю чакаць, калі вы, нарэшце, пакінеце хату. І як толькі за вамі зачыняюцца дзверы, з палёгкай уздыхнуўшы, яна патэлефануе сяброўцы і пакліча яе на экскурсію ў спецыяльную краму "Ванда". На пытанне "А твой дзе?" адкажа, што, дзякаваць Богу, на рыбу панесла. І скажа гэта з такім жа задавальненнем, з якім тысячу гадоў назад Ізольда паведаміла сваёй сяброўцы Брунгільдзе, што Трыстана панесла ў другі крыжовы паход.

Аднак ёсць хітрыкі, якіх трэба пазбягаць. Ніколі не ўцякайце з-пад полага Гіменея для выдуманай камандзіроўкі ў, скажам, Саратаў: дзень ад'езду і дзень прыезду ператворыцца ў адзін дзень, калі, увайшоўшы ў рэстаран "Патсдам", натрапіце на сваю жонку з сяброўкай ці школьным сябрам.

А як быць, калі думка правесці вечарок у халасцяцкім крузе з'яўляецца раптоўнай? Каб не пралічыцца з імправізацыяй, заўсёды нядрэнна мець у арсенале дакладна адпрацаваны прыём. Няварта тэлефанаваць жонцы і прымітыўна хлусіць, што сёння сход выбраных членаў Таварыства аховы помнікаў даўніны. Не, хай яна вернецца з работы і са здзіўленнем убачыць, што вы ўжо ў хаце, гуляеце з дзецьмі ў ваўка і семярых казлянят. Для большай пераканаўчасці рамантуйце цешчын туфель. Абавязкова пазяхайце, заўважаючы пры гэтым, што нядрэнна б сёння легчы спаць раней. І тут павінен празвінець званок: ваш прыяцель, як было дамоўлена, звоніць з бліжэйшага аўтамата.

— Цябе, з работы, — бурчыць жонка, якой вы з тактычных меркаванняў дазваляеце зняць трубку.

— Мяне няма ў хаце, — умольна шэпчаце вы.

— Позна, ужо сказала, што ты ёсць. Ідзі, можа ў іх што здарылася...

Вы раздражнёна бераце трубку: "Не-не, і не прасіце! Якая работа ў дзесяць гадзін вечара?". (Жонка слухае вашы рэплікі з узрастаючай цікавасцю). "Добра, можаце аб'явіць мне вымову". (Жонка насцярожваецца). "Ну, што ж, пазбаўляйце прэміі за квартал". (Жонка набліжаецца да вас). "Звальняйце!". (Жонка робіць вам знакі: маўляў, на пару гадзін). "І, калі ласка! Не трэба мне ніякай камандзіроўкі ў Парыж! Няхай едзе хто другі!".

Жонка, збялеўшы, кажа: "Ты што, з глузду з'ехаў? Зараз жа адпраўляйся на работу! Пра сябе не думаеш, пра дзяцей падумай!".

Карыстайцеся гэтымі рэцэптамі, і кожны ваш адыход з дому стане маленькім святам для сям'і.

Уладзімір ЯГОРЫЧАЎ.

З ГАРМАТ – ПА ГРЫБНІКАХ

Пачалася грыбная пара. Тысячы мінчан памкнуліся ў лясы на ціхае паляванне. Так было і сёлета 1 верасня. Я паехаў электрычкай на Асіповічы. Суседка па вагоне распавяла, што ў мінулым годзе на палігоне грыбнікоў напалохалі чэргамі з кулямётаў. Па шчырасці, я не паверыў ёй.

Прыехалі. Тамтэйшага лесу я не ведаю, таму пакрочыў за большасцю, мяркуючы, што яны, пэўна, ужо ведаюць грыбныя месцінкі. Ішлі доўга. Я ў аднаго здабытчыка пытаюся: "Куды кіруемся?" Ён у адказ: "На палігон. Сёння стральбы няма. Грыбоў там процьма".

Урэшце, перад намі раскінуўся дробны беразнячок. Зямля скрозь усыпана снараднымі асколкамі. "Божачка, — падумалася мне, — колькі тут металалому!" Праз хвілін пятнаццаць неўзабаве распачалася страляніна з гармат. Я ведаю гэткія выстралы — халастыя: у вайну быў артылерыстам. Увогуле ж баяцца быццам бы няма чаго. Мы не на палігоне, паблізу агароджы, папераджальных шчытоў няма. Але пасля халастых стрэлаў распачаўся баявы артабстрэл. Паблізу рваліся снарады. Асколкамі ссекла бярозку. Грыбнікі адступілі ў лясны гушчар. Дзіўна, але страляніна спынілася. Варта было аматарам ціхага палявання "выпаўзці" на ўзлесак, як ізноў ударылі з усіх гармат.

"Малайцы, сынкі, — сказаў адзін ветэран, — шчыра берагуць грыбы для сваіх афіцэраў". Увогуле, нават вопытныя ветэраны, якія прайшлі Айчынную, не адважыліся "ваяваць" з-за грыбоў.

Вярнуліся на станцыю. У аднаго мужчыны аказаўся прабітым руксак — "лёгка паранены". Страшна было падумаць, мо ў бярэзніку хтосьці застаўся ляжаць без дапамогі.

Уладзімір ЛУПЕЙКА.

ДАВЕРЛІВАСЦЬ – ЛІШНІ ГРУЗ...

Паспытаць шчасця ў так званым дробным бізнесе вырашыла адна з асіповіцкіх урачоў. Закупіўшы неабходнае, накіравалася яна ў слаўны град на Няве — Санкт-Пецярбург. Прадала ўсё добра і хутка. І радасная вярнулася ў неменш слаўны град Асіповічы.

І якое ж было яе здзіўленне, калі ўжо дома ўбачыла, што 50-даляравая купюра, у якую яна ўклала сваю сціплую, але цяжкую працу, аказалася проста-напраста фальшыўкай. А гэта ж было відаць, як кажуць, няўзброеным вокам.

Іван СЦЯПУРА.

ГАЛАДАЦЬ, ДЫК ПА–БІБЛЕЙСКУ

Цэлыя два тыдні працягваліся духоўныя гутаркі братоў і сясцёр з Ваўкавыскай царквы хрысціян адвентыстаў сёмага дня з жыхарамі і гасцямі горада. І былі адзначаны яны не толькі лекцыямі, праглядам слайдаў і кірмашамі рэлігійнай літаратуры. Беручы за аснову біблейскія тэксты, мясцовыя медыкі правялі з жадаючымі заняткі па рацыянальнаму харчаванню і лячэбнаму галаданню.

"ШКОЛЬНЫ" БУНТ

Вёска Сакалова Жабінкаўскага раёна, відаць, стане радзімай новага віду народнага бунту — "школьнага", якога, у адрозненне ад вядомых у гісторыі галоднага і халернага, можна было пазбегнуць, калі б мясцовыя ўлады праявілі больш такту і цярпення.

Падзеі развіваліся наступным чынам. Чыноўнікі з раёна і Хмелеўскага сельсавета прынялі рашэнне аб закрыцці з-за неперспектыўнасці і адсутнасці фінансаў Сакалоўскай пачатковай школы. Але калі з раёна прыбыла у вёску спецыяльная камісія, каб вывезці школьную маёмасць, ля будынка школы сабраліся вяскоўцы — паляводы, даяркі, мясцовая інтэлігенцыя. Такога павароту падзей "упанаўважаныя" ніяк не чакалі. Старшыня сельсавета Марыя Марыневіч з перапуду выклікала міліцыю. Але прадстаўнікі правапарадку ўмешвацца ў канфлікт не сталі, цвяроза разважыўшы, што людзі абараняюць інтарэсы сваіх дзяцей: адзінаццаць сёлетніх першакласнікаў, ды яшчэ з дзесятак малышоў, якія пачнуць вучобу ў будучым годзе. І хоць кіраўніцтва мясцовага калгаса "Радзіма" запэўнівала, што кожны дзень будуць вазіць дзяцей у школу за сем кіламетраў, у Хмелева, бацькі ў абстаноўцы энергетычнага крызісу ілюзій наконт гэтага не мелі. Урэшце, закрыццё адной з лепшых у раёне пачатковых школ з амаль ці не стогадовай гісторыяй азначала для сакалоўцаў страту часткі свайго жыцця, ды і проста веры у будучыню.

Паводле апошніх паведамленняў, што паступілі з Жабінкаўскага раёна, райвыканкам адмяніў рашэнне аб закрыцці пачатковай школы ў Сакалове. Але прэцэдэнт "школьнага" бунту ўжо быў створаны.

КУР'ЕР „ЧЗ"

Кур'ер "ЧЗ"

НАШЭСЦЕ ТАРАКАНАЎ

Пагрозу набывае нашэсце тараканаў у многія кватэры гамяльчан. Прычым, нязваныя госці "акупіруюць" не толькі неахайнае жыллё, але і самае чыстае. Прычыны з'яўлення небывалай колькасці гэтых шкодных насякомых, на думку спецыялістаў, дзве: гарачае лета, якое садзейнічала іх размнажэнню і фактычнае спыненне масавай апрацоўкі дамоў санітарнай службай горада.

— Мы сутыкнуліся з тымі ж праблемамі, што і работнікі іншых галін народнай гаспадаркі, — гаворыць загадчыца аддзела прафілактычнай дэзінфекцыі гарадской санітарна-эпідэміялагічнай станцыі Нэлі Кір'яненка. — Сваіх ядаў для барацьбы з насякомымі і шкоднікамі Беларусі няма, а прадпрыемствы Расіі просяць за іх валюту або расійскія рублі. Пакуль, як можам, выконваем дагаворныя абавязацельствы перад дзіцячымі садкамі, школамі, бальніцамі, арганізацыямі грамадскага харчавання. Што ж датычыць жыхароў шматпавярховых дамоў, то цяпер санітарная апрацоўка кватэр не кожнаму па кішэні.

БЕЛІНФАРМ.

ЦІ БУДЗЕМ З БУЛЬБАЙ

Хто з нас не любіць бульбяных аладак. Адно аб'ядзенне. Але, відаць, гэтую магчымасць будуць мець не ўсе. Справа ў тым, што гаспадаркі Асіповіцкага раёна больш чым у два разы скарацілі сёлета плошчы пад бульбу.

І яна сёлета тут займае толькі 500 гектараў. Віды на ўраджай не вельмі добрыя — пад сто цэнтнераў "абяцае" кожны гектар. А апетыт на бульбу не паменшыўся, наадварот. Суцяшае тое, што ў некаторых гаспадарках, ды і на асабістых сядзібах, бульба ўрадзіла лепш. Можа ў наступным годзе бульбачка тут зойме большыя плошчы...

Іван СЦЯПУРА.

ДУМАЮЧЫ ПРА БЕЛАРУСЬ

Вучань адной маладзечанскай школы вырашыў даведацца, які лёс чакае Беларусь. І... дазваніўся да далёкай Аўстраліі.

Званок на другое паўшар'е Зямлі каштаваў круглую суму грошай. Рахунак, які прыслала АТС бацькам гэтага хлопчыка, так іх узрушыў, што будучае краіны проста пацямнела ў параўнанні з лёсам іх сямейнага бюджэту.

Мікола КАПЫЛОВІЧ.

ПРОСТА ЖЫВІ І ВЫЛЕЧЫШСЯ

Аршанскае жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае прадпрыемства пабудавала цэх, у якім будзе выпускаць зрубы дамоў і лазняў з бруса. Крыху незвычайнага...

Ён апрацаваны спецыяльнай праціткай, што мае аздараўленчыя ўласцівасці пры захворваннях на радыкуліт. Адпаведнае заключэнне і дазвол на такое лекавае будаўніцтва дало аршанцам яшчэ былое Міністэрства аховы СССР. Так што, без рэцэпту можна атрымаць медыкаменты і лячыцца сабе на здароўе, проста жывучы ў сваёй хаце.

Яўгенія ВІЦЬБА.

З ЖЫЦЦЯ ЗОРАК

СМЕРЦЬ ТЭРАНСА ЯНГА

У бальніцы французскага горада Каны ад сардэчнай недастатковасці памёр вядомы брытанскі прадзюсер Тэранс Янг. Яму было 79 гадоў.

Сярод 30 фільмаў, створаных пад яго кіраўніцтвам, — першыя серыі з прыгод агента 007 Джэймса Бонда.

МАЎЧАННЕ – ЗОЛАТА

Вядомы амерыканскі спявак кубінскага паходжання Джон Секада заявіў, што збіраецца падаць у суд на адну аргенцінскую газету, якая апублікавала яго інтэрв'ю.

Яму прыпісваецца станоўчы водгук аб дасягненнях Кубы ў гады кіравання Фідэля Кастра. Музыкант назваў гэта інтэрв'ю ілжывым і заявіў, што ніколі не ставіўся да рэжыму Кастра з сімпатыяй.

ДЖЭКСАН І КАМПАНІЯ

Першае выступленне Майкла Джэксана на сцэне пасля яго сусветнага турнэ адбылося ў чацвер на цырымоніі ўручэння ўзнагарод MTV у Нью-Йорку.

Кампанію Джэксану ў Радыё Сіці мюзік-холе склалі такія вядомыя музыканты як Брус Спрынгсцін, групы "Ролінг Стоўнз", "Аэрасміт", "Бісці Бойз". Прамая трансляцыя з цырымоніі вялася на ўсю Амерыку.

ШЧАСЛІВЫЯ РАЗАМ

Род Сцюарт зноў будзе выступаць разам са сваёй ранейшай групай "Фэйсіз".

Пасля іх расколу мінула ўжо 12 гадоў. Цяпер музыканты заняты тым, што рыхтуюць сумесную праграму, з якой яны выступяць у некалькіх краінах.

АЎРОРА ЗНАЙШЛА БАЦЬКУ

Парыжскі суд прызнаў 18-гадовую Аўрору Дросар дачкой вядомага акцёра Іва Мантана, які памёр у 1991 годзе ва ўзросце 70 гадоў.

Пры жыцці Мантан неаднаразова адмаўляўся зрабіць аналіз сваёй крыві для праверкі, ці з'яўляецца ён на самай справе бацькам Аўроры. Сам жа акцёр пры жыцці быў вядомы ўсім як "французскі палюбоўнік". Сярод яго сяброўак былі Мэрылін Манро, Эдзіт Піяф і, мяркуючы па ўсім, многія іншыя.

КАЗКА КАЗАК

Майкл Джэксан і яго жонка Ліз-Мары Прэслі пакінулі Дыснейлэнд, дзе правялі 3 дні свайго мядовага месяца.

Увесь гэты час яны наймалі прэзідэнцкія апартаменты шыкарнага "Дысней-атэля".

ФОНДА НА ФОРУМЕ

Выступленне вядомай актрысы Джэйн Фонды на Кіпрскім форуме па пытаннях народанасялення выклікала найбольшую цікавасць у яго ўдзельнікаў.

Актрыса заявіла, што ў выпадку прыняцця глабальнай "праграмы па кантролю за насельніцтвам", пытанне аб абортах адпадзе само сабой. Станоўчыя адносіны Фонды да легальных абортаў выклікала абурэнне ў значнай часткі прысутных, асабліва з ісламскіх дзяржаў.

ПАД "КАЎПАКОМ"

Прафесар каліфарнійскага універсітэта Джон Уэйнер заявіў, што Джон Ленан працяглы час знаходзіўся пад назіраннем Федэральнага бюро расследаванняў ЗША.

Згодна з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў персанальнай справе былога бітла, галоўнай прычынай сачэння была антываенная накіраванасць спевака. Аднак нават пасля таго, як Ленан адышоў ад актыўнага ўдзелу ў антываенных акцыях, сачэнне, тым не менш, працягвалася.

ПРЫНЦ ЧАРЛЬЗ "ПАЙШОЎ ПА РУКАХ"

Прынц Чарльз "упрыгожыў" сваім голым целам 1-ю старонку нямецкай газеты "Більд-цайтунг".

Па-рознаму рэагавалі чытачы на фота прынца. Але некаторыя лічаць, што цела ў прынца прыгожае, і яго можна параўноўваць з Давідам на карціне Мікеланджэла.

ТЫДЗЕНЬ ПА ГАРАСКОПУ



12—18 верасня

ДЗЕВА

На гэтым тыдні вам лепш не выязджаць у дарогу: перашкоды і няўдачы.

Сур'ёзныя справы пачніце 14-га.

У выхадныя больш часу правядзіце ў сям'і.

ШАЛІ

12-га і 15-га дзелавыя камандзіроўкі будуць паспяховымі.

Пастарайцеся не канфліктаваць з ахоўнікамі парадку. Пазбягайце непаразуменняў на працы.

У нядзелю магчымы новыя цікавыя знаёмствы.

СКАРПІЁН

Усё важнае для вас пачніце 14-га. Звярніцеся па дапамогу да сваіх сяброў.

У канцы тыдня магчымы фінансавыя паступленні. Перамены ў лепшы бок у інтымным жыцці.

СТРАЛЕЦ

Поспех ва ўсіх вашых пачынаннях у панядзелак і сераду. Пастарайцеся высветліць усе непаразуменні ў каханні.

Нядзеля спрыяльная для падарожжаў за горад.

КАЗЯРОГ

12-га і 15-га магчымы цудоўныя перамены ў асабістым жыцці. Рызыкуйце ў бізнесе. Не адмаўляйцеся ад дапамогі даўніх знаёмых.

Выхадныя правядзіце за горадам. Займіцеся спортам.

ВАДАЛЕЙ

12-га і 15-га — удача ў фінансавай сферы.

Больш часу праводзьце ў сям'і. Не канфліктуйце з супрацоўнікамі і блізкімі, каб у далейшым не шкадаваць. Перамены ў каханні.

Асцярожней 13-га, 17-га і 18-га.

РЫБЫ

Займіцеся паляпшэннем свайго быту ў панядзелак. Хутка зменіцца становішча на працы і ў асабістым жыцці.

З вырашэннем фінансавых праблем вам лепш пачакаць. Асцерагайцеся новых знаёмстваў.

Перамены ў бізнесе.

АВЕН

12-га — поспех ва ўсіх вашых пачынаннях. Паляпшэнне матэрыяльнага становішча.

Будзьце ўважлівымі з дзелавымі паперамі ў чацвер. Не верце ніякім плёткам. Шмат новых знаёмстваў.

ЦЯЛЕЦ

Удача ў паездках 14-га і 15-га. Устрымайцеся ад вырашэння матэрыяльных праблем.

Цудоўны час для ўсіх вашых пачынанняў. Гармонія ў каханні.

БЛІЗНЯТЫ

У аўторак магчымы фінансавыя непаразуменні. У матэрыяльнай сферы вам лепш не рызыкаваць. Перачакайце.

Не адпраўляйцеся ў дарогу 18-га. Не злоўжывайце алкаголем. Больш часу прысвяціце сям'і.

РАК

Стабілізуецца становішча на працы, у сям'і. Але не перанапружвайце вашу нервовую сістэму, каб сур'ёзна не захварэць.

У апошнія дні тыдня ў падарожжы вам лепш не выязджаць.

ЛЕЎ

Дзейнічайце абачліва 13-га, 14-га, 17-га і 18-га.

У астатнія дні ўдзяліце больш увагі вашым каханым. Асцерагайцеся нервовых зрываў.

АДАМ І ЕВА

Ты і я

Пісьмо былому мужу



Я ўсё табе даравала, але нічога не забыла. І калі сёння я ўсміхаюся табе, усмешка ўсё роўна атрымліваецца сумная.

Тады ў нас толькі-толькі нарадзілася Маша. Яе прывезлі з раддома, паклалі ўпоперак канапы, і пакуль яна спала, мы, схіліўшыся над ёю, нават дыхаць стараліся ледзь чутна. На нейкі момант падалося, што з гэтай хвіліны, з гэтага імгнення ўсё будзе добра, таму што наша з табою сумеснае жыццё, наш працяглы зарэгістраваны раман урэшце набыў сэнс.

Але дарэмна я радавалася... О не, ты не быў дрэнным бацькам, хоць і пабойваўся крыху падыходзіць да дачкі. Яна палохала цябе сваімі мікраскапічнымі памерамі і бясконцым плачам. У такім выпадку ты заўсёды клікаў на дапамогу мяне, а сам ішоў у іншы пакой. Я разумела цябе, ты перажываў складаны этап ператварэння ў мужчыну — і старалася не дакучаць. Паступова кола тваіх абавязкаў звузілася да мінімуму — раз на дзень адпрасаваць невялікі стос пялёнак. Але нават гэта раздражняла і нервавала цябе — я ўсё часцей знаходзіла стосік некранутым. Адначасова я заўважыла, што цябе нібы точыць знутры нейкая туга — ты клаўся на канапу, уключаў магнітафон, браў навушнікі і разам з першымі гукамі музыкі быццам знікаў. На гадзіну, а то і на дзве. Не даклікацца, не дапрасіцца. На пліце ва ўсю паддавала пары выварка з дзіцячай бялізнай, закіпала і "бегла" на пліту каша, у ваннай вада для купання пералівалася цераз бераг, Маша заходзілася ад плачу, бо ранка ў яе на жываце чамусьці не хацела загойвацца... Я ні аб чым не прасіла цябе. Здавалася, ты павінен быў усё зразумець сам. І прыйсці на дапамогу. Але па нейкай злой іроніі лёсу маю слабасць ты ўпарта прымаў за сілу, а маё тактоўнае маўчанне — за гэткае дурнаватае жаданне ўсё паспяваць рабіць самой. Цяпер я разумею, што табе проста было зручна так сябе паводзіць. А я...

Дзеля цябе і твайго спакою я гатовая была мыць падлогу і бялізну, варыць абрыдлыя кашы, кіпяціць цэлыя вываркі пялёнак, прасаваць, уставаць па начах, хадзіць на прагулкі, насіцца па аптэках, малочных кухнях і магазінах, гатаваць табе абед і вячэру, і... і... і... Я не чакала ад цябе слоў удзячнасці, бо ўсяго толькі выконвала свае абавязкі. Але словы падтрымкі ты б мог знайсці. Яны і толькі яны былі патрэбны мне больш за хлеб надзённы. Падышло б нават штонебудзь просценькае, збітае, напрыклад,:"Мілая мая", ці "Як добра, што ты ёсць". Я так і не дачакалася гэтых слоў. Затое аднойчы ты прынёс дадому чыйсьці вытанчаны залаты пярсцёнак. Здагадацца аб яго прыналежнасці было нескладана. Я зразумела, што ты мне здрадзіў.

Зразумела... Ты і не збіраўся хаваць сваіх "забароненых" пачуццяў. Гэта, аказваецца, ёй, а не мне, патрэбна была твая падтрымка. Гэта яна здавалася табе адзінокай, няшчаснай, бездапаможнай. Гэта да яе ты ляцеў па першаму закліку, кідаючы мне ўжо ў дзвярах давяральна-абразлівае:"Ёй дрэнна..." Я нічога не магла зрабіць з тваім абяззбройваючым і нікому не патрэбным жаданнем гаварыць праўду. Так табе было значна лягчэй. Ты нібыта перакладваў на мае плечы цяжар сваёй віны. І мы неслі яго ўдваіх. Час ад часу я рабілася тваім святаром, а ты прыходзіў да мяне на споведзі і, паклаўшы на мае калені, як на алтар, галаву, расказваў мне ўсё новыя і новыя падрабязнасці вашых адносін. Я ненавідзела і шкадавала цябе адначасова. Ты аддаваў мне свой боль, пра які я нічога не хацела ведаць. Мне хапала сваіх праблем...

Амаль кожны вечар пасля работы ты знікаў — з некаторага часу выносіць гэта было лягчэй за тваю прысутнасць. Пытанні "куды?" і "калі?" цябе раздражнялі, і я, зразумела, перастала іх задаваць. Тым больш, што амаль дакладна ведала адказ. Ты хадзіў у тыя кафэ і рэстараны, што і яна, а калі не знаходзіў яе там, дык проста гуляў па вуліцах, аддаючыся марам і ўспамінам.

Памятаеш, як захварэла Маша? О, ты не можаш гэтага памятаць, бо чалавечая памяць убірае ў сябе толькі імгненні ўласных радасці ці болю. А нашых ты тады не заўважаў. Пяцімесячная дачка з тэмпературай пад сорак кідалася з боку на бок у сваім маленькім ложку. Ёй тэрмінова патрэбны былі лекі, і я кінулася шукаць цябе па ўсіх вядомых нумарах тэлефонаў. Дзякуй Богу, знайшла, папрасіла прыехаць па рэцэпты і збегаць у аптэку. Ты не адмовіўся, як звычайна, а сказаў?: "Чакай, еду". Я чакала да наступнай раніцы, пакуль твае сябры, з якімі ты цэлы вечар прасядзеў у "Планеце", а потым яшчэ паехаў да аднаго на кватэру, не прывезлі цябе дадому. Сварыцца з табой, пераконваць, ушчуваць было дарэмнай тратай часу. Твае вочы глядзелі праз мяне, а думкі былі вельмі далёка ад хворай дачкі.

...Ты прасіў мяне "перачакаць" тваё захапленне. І я чакала, таму што ісці не было куды. І таму, што я цудоўна разумела: як гэта ні парадаксальна гучыць, ты таксама кахаеш мяне, а ўсё астатняе для цябе — часовая з'ява, тое, што здараецца з кожным мужчынам хоць раз у жыцці.

"Калі гэта тваё, яно нікуды не дзенецца",— гаварыла мне некалі бабуля. Я інтуітыўна адчувала, што ты — гэта "маё". Я змагалася за цябе моўчкі, употайкі глытаючы слёзы. Нават паплакаць уволю не магла сабе дазволіць — малая кармілася маім малаком. Каюся — бывалі дні, калі пра цябе я ўспамінала часцей, чым пра яе. І калі расказвала ёй вершыкі ці спявала песні, думала толькі пра адно: ці прыгожа гучыць мой голас і ці чуеш яго ты?

Купанне Машы таксама праходзіла без твайго ўдзелу. Я неяк прыладзілася адной рукой "страхаваць" знізу мяккае маленькае цельца, а другой паліваць і абмываць яго. Толькі адзін раз я папрасіла цябе дапамагчы — калі выключылі ацяпленне і гарачую ваду, і трэба было насіцца праз усю кватэру з тазікамі і збаночкамі... Памятаеш, што ты адказаў? "У цябе самой гэта нядрэнна атрымліваецца..."

Я незлапамятная, але ёсць рэчы, якія нельга забываць. Інакш перастанеш паважаць сам сябе. Я змагалася са сваёй памяццю, імкнучыся запіхнуць у самыя далёкія цёмныя яе куткі думкі пра тваю элементарную непрыстойнасць і бязмежны эгаізм. Я заклікала на дапамогу ўсё добрае, што калісьці было ў нас і з-за чаго мы так доўга адчувалі сябе шчаслівымі.

Але ў тваіх блакнотах я знаходзіла вершы, прысвечаныя не мне. А абразлівае "ідзі спаць!", калі я аднойчы паспрабавала прытуліцца да цябе, лепш за ўсё дало зразумець, што тваё захапленне знаходзіцца яшчэ ў стадыі развіцця...

Я падарыла табе неабмежаваную свабоду, бо калі б і надумалася заперці дзверы, ты вылез бы праз фортку. Я сама перарвала ўсе ніці, якія прывязвалі цябе да мяне, бо чым мацней нацягваеш ланцуг, тым далей потым адлятае той, хто быў навязаны на ім. Я паглядзела на ўжо вялікую — цэлых паўгода! — дачку і зразумела, які ты дурны. Дачка ўсміхнулася, паказаўшы два першыя зубы — і ўсе твае пакутлівыя пошукі сэнсу жыцця пад чужой спадніцай здаліся мне вартымі жалю. Я доўга прывыкала і, нарэшце, навучылася жыць без цябе. Мне стала лёгка. Гэта адляцела каханне.

